УДК 174

# МОЎНЫЯ АСПЕКТЫ ПРАФЕСІЙНАЙ ДЭФАРМАЦЫІ СУПРАЦОЎНІКАЎ ОРГАНАЎ УНУТРАНЫХ СПРАЎ

*У. В. Мельнікаў,*
*курсант факультэта міліцыі Магілёўскага інстытута МУС*
*Навуковы кіраўнік: С. В. Венідзіктаў,*
*начальнік кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін*
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

Прафесійная дэфармацыя (ад лац. deformatio — “скажэнне”) уяўляе сабой працэс кагнітыўнага скажэння, псіхалагічнай дэзарыентацыі асобы, выкліканы перманентным уздзеяннем знешніх і ўнутраных фактараў, звязаных з выкананнем прафесійнай дзейнасці. Выпрацаваныя прафесійныя патэрны паводзінаў маюць уласцівасць распаўсюджвацца на іншыя сферы жыццядзейнасці. У кантэксце нашага даследавання цікавасць выклікае прафесійная дэфармацыя маўленчай дзейнасці супрацоўнікаў органаў унутраных спраў як своеасаблівы негатыўна-прававы стыль зносін.

Псіхалінгвістычныя даследаванні паказваюць, што прафесійная дэфармацыя маўлення тыповая для супрацоўнікаў розных падраздзяленняў органаў унутраных спраў. Яе прычынамі называюць: 1) спецыфіку сацыяльнага асяроддзя, што прадвызначае выбар маўленчых мадэлей; 2) абмежаванасць маўленчых сітуацый, тыповых для супрацоўнікаў, і выкліканы гэтым абмежаваны набор стылёвых, лексіка-семантычных і невербальных рэсурсаў мовы; 3) паглыбленне прафесійнай спецыялізацыі, тыпізацыі маўлення (штодзённая праца па вырашэнні тыповых, стандартызаваных задач, з аднаго боку, удасканальвае прафесійныя веды, з другога — фарміруе прафесійны слэнг, вызначае стыль мыслення і зносін).

Вылучаецца 3 групы фактараў маўленчай дэфармацыі, звязанай з выкананнем прафесійных абавязкаў: нарматыўна-службовыя, асобасныя і сацыяльна-псіхалагічныя. Часовай мяжой, якая вызначае незваротныя працэсы маўленчай дэфармацыі, з’яўляецца чацвёрты год службы: гэта праяўляецца ў фарміраванні пласту прафесійна арыентаванай лексікі, у змешванні гутарковага і афіцыйна-дзелавога стыляў у зносінах, парушэнні тэмпу гаворкі, страце здольнасці да пабудовы аб’ёмных лагічных выказванняў.

Спосабам прафілактыкі маўленчай дэфармацыі з’яўляецца павышэнне інтэлектуальнага, духоўнага і маральнага ўзроўню супрацоўнікаў органаў унутраных спраў, развіццё маўленчай культуры ў межах заняткаў па службовай

і ідэалагічнай падрыхтоўцы, фарміраванне навыкаў эфектыўнай маўленчай камунікацыі ва ўмовах маўленчага процідзеяння. У сувязі з гэтым асаблівае значэнне набывае прафесійная адукацыя, якая ўлічвае неабходнасць процідзеяння магчымым негатыўным наступствам практычнай дзейнасці супрацоўнікаў.

**Спіс асноўных крыніц**

1. Венидиктов, С. В. Риторика : учебник для курсантов и студентов учреждений высшего образования по юридическим специальностям / С. В. Венидиктов, С. И. Даниленко. – Минск : РИВШ, 2017. – 236 с.

2. Голубев, В. Л. Речевой потенциал сотрудника органов внутренних дел : практ. пособие / В. Л. Голубев, О. В. Бурибо. – Минск : Академия МВД, 2010. – 299 с.

3. Порубов, Н. И. Риторика : учеб. пособие / Н. И. Порубов. – 2-е изд., перераб. – Минск : Выш. шк., 2004. – 352 с.